УДК 631.15

*Л.І. Ермаковіч*

# СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЕ РАЗВІЦЦЁ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 1939–1941 гг.

У артыкуле разглядаюцца і аналізуюцца першасныя мерапрыемствы савецкай улады ў галіне сельскай гаспадаркі Брэсцкай вобласці пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР восенню 1939 года ўключна да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Пры гэтым галоўная ўвага надаецца характарыстыцы тых мерапрыемстваў, якія былі накіраваны на абмежаванне эканамічнай свабоды і гаспадарчай самастойнасці селяніна і стварэнне адпаведных умоў для развіцця сялянскай гаспадаркі па сацыялістычным (калгасным) шляху. Падсумоўваюцца эканамічныя і сацыяльныя наступствы аграрных пераўтварэнняў, якія, на думку аўтара, супярэчылі прыроджанай сутнасці сялянскага ўкладу жыцця і мелі яскравы антысялянскі характар.

## Уводзіны

Праблемам развіцця аграрных адносін у розныя часы, у тым ліку ў савецкі час, у айчыннай гістарычнай навуцы надаецца належная ўвага. Не мог не выклікаць цікавасці ў навуковых спецыялістаў і такі гістарычны перыяд, як аграрныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі ў перадваенны перыяд (1939–1941 гг.). Аднак пры гэтым навукоўцамі разглядаюцца пераважна пытанні ажыццяўлення калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларусі. Намнога менш распрацаваны такія аспекты аграрнай палітыкі, як адносіны ўлады да індывідуальнай сялянскай гаспадаркі, масава-палітычная праца па змяненні грамадскай псіхалогіі ў вёсцы, мясцовыя саветы на службе ўлады, на чым якраз акцэнтуецца ўвага аўтара. Акрамя таго, да выбару тэмы артыкула спрычынілася і тая акалічнасць, што тэма мае краязнаўчы аспект, які пакуль што не знайшоў свайго глыбокага адлюстравання ў навуковай літаратуры. Да таго ж у артыкуле выкарыстоўваецца архіўны матэрыял, які ўпершыню ўводзіцца ў навуковы ўжытак.

## Развіццё сельскай гаспадаркі Брэсцкай вобласці ў перадваенны перыяд (1939–1941 гг.)

Брэсцкая вобласць была ўтворана 4 снежня 1939 года з тэрыторыі Брэсцкага, Кобрынскага і Пружанскага паветаў Палескага ваяводства Польшчы. Яна была падзелена на 18 раёнаў: Антопальскі, Брэсцкі, Бярозаўскі, Высокаўскі, Гайнаўскі, Дамачаўскі, Дзівінскі, Жабінкаўскі, Камянецкі, Кляшчэльскі, Кобрынскі, Косаўскі, Маларыцкі, Поразаўскі, Пружанскі, Ружанскі, Сямяціцкі і Шарашоўскі. Яе даваенная тэрыторыя складала прыкладна палову сучаснай тэрыторыі Брэсцкай вобласці.

Адразу пасля прыходу Чырвонай Арміі на Берасцейшчыну напрыканцы верасня 1939 г. тут распачаліся сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў вёсцы. Першым крокам на шляху гэтых пераўтварэнняў стала вынішчэнне польскага памешчыцкага і асадніцкага землеўладання. 29 кастрычніка 1939 года Народны сход Заходняй Беларусі прыняў Дэкларацыю аб канфіскацыі зямель памешчыкаў, кляштараў, буйных дзяржаўных чыноўнікаў з усім інвентаром, сядзібнымі пабудовамі і жывёлай. Уся зямля абвяшчалася дзяржаўнай уласнасцю.

Ліквідавалася таксама асадніцкае землеўладанне. Толькі ў лютым 1940 г. з Брэсцкай вобласці было выселена 1 585 асаднікаў і работнікаў лясной аховы. Выселеным асаднікам належала 1 267 коней, 3 772 галавы буйной рагатай жывёлы, 1 893 авечкі, 2 814 свіней, 13 504 хатнія птушкі, 1 198 вуллёў з пчоламі, 7 318 цэнтнераў збожжа, 33 457 цэнтнераў бульбы, 1 034 жылыя дамы, болей за 3 тыс. гаспадарчых пабудоў [1, с. 202].

Наступным крокам стала ліквідацыя сялянскага беззямелля і малазямелля шляхам перадачы ў карыстанне батракам і беднякам зямель, канфіскаваных у былых польскіх

уладальнікаў. Гэта быў палітычна і эканамічна пазітыўны крок. Ён, па-першае, прыцягнуў на бок савецкай улады батрацка-бядняцкую частку вёскі праз задавальненне яе галоўнага эканамічнага інтарэсу. Па-другое, павялічылася праслойка сярэдняга сялянства, а разам з тым узраслі і яго матэрыяльны дабрабыт і падатказдольнасць. У канчатковым выніку такое вырашэнне зямельнага пытання садзейнічала спалучэнню інтарэсаў сялянства і савецкай дзяржавы.

Здавалася б, што і надалей патрэбна было ажыццяўляць адпаведныя крокі па ўздыме індывідуальнай сялянскай гаспадаркі. Гэтыя крокі, у прыватнасці, вымагалі стварэння сістэмы ільготнага крэдытавання, развіцця розных формаў кааперацыі ў вёсцы, павышэння агратэхнічнага ўзроўню сялянскай працы, увядзення ашчаднай падатковай сістэмы, матэрыяльнага стымулявання вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі праз павелічэнне дзяржаўных закупачных цэн і інш. Аднак у такім рэчышчы дзяржаўная палітыка мэтанакіравана і няўхільна па сутнасці не вялася. Адзіным значным мерапрыемствам стаў завоз у Заходнюю Беларусь, у тым ліку і Брэсцкую вобласць, рознага сельскагаспадарчага інвентару і выдача сялянам ільготнай насеннай ссуды вясной 1940 г. [1, с. 202].

Яшчэ адным крокам насустрач сялянам-беднякам стала выдзяленне ім крэдытаў на ліквідацыю бескароўнасці. Усяго на гэтую справу Брэсцкай вобласці было выдзелена на 1941 г. 1 млн 193 тыс. рублёў доўгатэрміновага крэдыту [2]. Прыкладная сума крэдыту на адну сялянскую гаспадарку складала 200–350 рублёў. Атрымаўшы крэдыт, сяляне часта выкарыстоўвалі яго на куплю коней, свіней і нават вопраткі [2]. Прычына немэтавага выкарыстання крэдыту часта мела эканамічнае адценне: набыўшы карову, сяляне адначасова абкладваліся дзяржавай абавязковымі пастаўкамі малака і мяса, якія з-за сваёй велічыні абясцэньвалі каштоўнасць каровы ў вачах селяніна.

Неўзабаве, а менавіта з вясны 1940 г., эканамічны ціск на сялянства павялічыўся, яно ўпершыню стала абкладвацца сельгаспадаткам (у грашовай форме) і абавязковымі дзяржаўнымі пастаўкамі сельгаспрадукцыі (малака, мяса, воўны, ільну, збожжа, бульбы). Пры гэтым велічыня падатку і натуральных паставак дзяржаве ўстанаўлівалася ў залежнасці ад колькасці працаздольных членаў сям’і, зямлі і жывёлы ў сялянскай гаспадарцы.

Падатковы прэс усё больш і больш ціснуў селяніна да долу. Велічыня абавязковых выплат дзяржаве ўвесь час павялічвалася, пераадольваючы ўсе рацыянальныя эканамічныя абгрунтаванні. У прыватнасці, пры вызначэнні падатку і натуральных паставак улічвалася ўся зямля, якая знаходзілася ў карыстанні селяніна, г.зн. не толькі ворыўная, але таксама пашы, сенажаці, пусткі, хмызнякі. Акрамя таго, сялянскія гаспадаркі абкладаліся з улікам рыначных прыбыткаў, але тыя ж гаспадаркі пастаўлялі дзяржаве сельгаспрадукцыю па дзяржаўных фіксаваных цэнах, якія былі вельмі нізкімі, намнога меншымі, чым кірмашовыя.

Натуральна, што такая практыка выклікала незадавальненне сялян, якія вельмі часта звярталіся да ўладаў з просьбай зменшыць падатковы ціск. Вось адзін прыклад: селянін М.У. Лянча з вёскі Красналескі Красналескага сельсавета Кобрынскага раёна ў чэрвені 1940 г. звярнуўся з хадайніцтвам у райвыканкам аб зніжэнні абавязковых дзяржпаставак. Сутнасць заявы наступная: ворыўнай зямлі ён мае ўсяго 5 гектараў, сенажаці – 4 гектары, а астатнія 20 гектараў складае пустка. Але ён пастаўляе дзяржаве 300 кг мяса за ўсю зямлю [3]. Аднак у хадайніцтве селяніну было адмоўлена на той падставе, што пастаўкі налічваюцца з усёй зямельнай плошчы, а таму налічаны правільна. Увогуле такія хадайніцтвы часткова задавальняліся ў выключна рэдкіх выпадках. Найчасцей размова магла ісці толькі аб адтэрміноўцы абавязковых дзяржпаставак.

У такіх абставінах сяляне вымушаны былі стаць на шлях затрымкі і невыканання натуральных паставак дзяржаве. Гэтая практыка была паўсюднай па вобласці, датычылася літаральна ўсіх раёнаў, сельсаветаў і усіх відаў сельгаспрадукцыі. На такую сітуацыю ўлады рэагавалі шырокім выкарыстаннем адміністрацыйных метадаў, разгортван-

нем масава-палітычнай работы, маральным і ідэалагічным прэсінгам. Звычайнай практыкай стала рассылка сялянам пісьмаў наступнага зместу: «Райисполком располагает сведениями, что Вы стали на путь задержки хлебопоставок государству и этим самым не выполняете государственных законов. Обязываю Вас немедленно приступить к хлебосдаче и доложить о выполнении к ... (указваўся тэрмин. – Л.Е.)» [4].

Складаная сітуацыя з дзяржпастаўкамі стала аб’ектам палітычна завостранага рэагавання партыйнага кіраўніцтва вобласці і рэспублікі. У жніўні 1940 года адбыўся сход партыйнага актыву Брэсцкай вобласці, на якім выступіў сакратар ЦК КП(б)Б П. Панамарэнка. Ён крытыкаваў работу абласной партарганізацыі ў справе правядзення хлебапаставак. Адначасова адзначыў, што ў заходніх абласцях Беларусі асноўная маса сялянства – гэта аднаасобнікі, і таму трэба бачыць, што вакол хлебапаставак у вёсцы разгортваецца вострая класавая барацьба [5]. Такім чынам, у зрыве дзяржпаставак улады, па сутнасці, абвінавацілі не саміх сябе, не сваю грабежніцкую палітыку ў вёсцы, а сялянства.

Каб ухіліцца ад падаткаў і застрахавацца на выпадак магчымых рэквізіцый, восенню 1940 г. сяляне сталі на шлях утойвання і нават забою ўласнай жывёлы. Гэтыя факты былі ўстаноўлены ў Дамачаўскім і шэрагу іншых раёнаў вобласці [6]. Асабліва шырокі забой жывёлы меў месца ў шэрагу сельсаветаў Кобрынскага раёна [7].

Мелася таксама нямала фактаў утойвання сялянамі фактычнай колькасці зямлі ў карыстанні. Так, у Кобрынскім раёне селянін А.М. Назарчук замест фактычна належаўшых яму 60-ці гектараў зямлі падаў звесткі на 36 гектараў, а селянін К.У. Нічыпарук утаіў ад дзяржавы 30 гектараў [8].

Галоўным правадніком дзяржаўнай палітыкі ў вёсцы з’яўляліся сельскія саветы, якія павінны былі абслугоўваць інтарэсы сялянства, а па сутнасці абслугоўвалі інтарэсы ўлады. Першай запаведдзю сельсаветаў лічыўся поўны і своечасовы разлік з дзяржавай па хлебных і іншых натуральных пастаўках [9]. Яны адказвалі за выкананне планаў дарожных і будаўнічых работ, асушэнне балот і за многае іншае. Імі камандаваў кожны, каму ўздумаецца. Так, загадчык Камянецкага раённага аддзела сацыяльнага забеспячэння абавязаў усе сельсаветы раёна за 2 дні падаць звесткі, «сколько в сельсоветах глухих и оглохших», а загадчык дарожнага аддзела Кобрынскага райвыканкама прадпісаў сельсаветам даслаць спісы ўсіх... цяжарных жанчын [10].

Прадстаўніцтва сялян у саветах больш высокага ўзроўню было нязначным, нягледзячы на тое, што сяляне складалі болей за 80% усяго насельніцтва. Напрыклад, паводле рэгістрацыйнага спісу дэпутатаў І-й сесіі Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў працоўных, якая адбылася ў снежні 1940 г., з 44-х прысутных на сесіі дэпутатаў толькі 5 былі прадстаўлены сялянамі-аднаасобнікамі [11]. У асноўным дэпутатамі райсавета з’яўляліся служачыя, кіраўнікі розных мясцовых партыйных, савецкіх і гаспадарчых структур, вайскоўцы. Зразумела, што пры такім прадстаўніцтве паўплываць на дзейнасць саветаў сяляне не маглі. Аднак гэта не перашкаджала саветам усіх узроўняў, розным іншым грамадскім і дзяржаўным установам гаварыць ад імя селяніна пры амаль поўным маўчанні апошняга. Змест гэтай гаворкі наступны: усё працоўнае сялянства адабрае дзяржаўную палітыку ў вёсцы, бо яна з’яўляецца праяўленнем штодзённага клопату сацыялістычнай маці-радзімы аб сельскім працаўніку, які ў адказ на клопат аднадушна падтрымлівае савецкую ўладу і шчыра дзякуе ёй за радаснае і шчаслівае жыццё.

Увогуле вядзенню масава-палітычнай работы ў вёсцы, якая ахінался ў пампезнадэмагагічную форму, мела яскравы агітацыйна-прапагандысцкі характар, надавалася вялікая ўвага, бо лічылася, што «страснае бальшавіцкае слова агітатара не толькі ўпэўнівае масы, але і запальвае, пабуджае іх творчую энергію і ініцыятыву, мабілізуе на выкананне гаспадарча-палітычных кампаній, выкананне рашэнняў партыі і ўрада» [12].

Трэба адзначыць, што магутны вал агітацыйна-прапагандысцкай работы аказваў уздзеянне на сялян, перш за ўсё на яе батрацка-бядняцкую частку, бо ёй не было чаго

губляць, і таму яна звязвала з савецкай уладай надзеі на сваё лепшае жыццё. Думкі і настроі гэтых сялян, якія апынуліся ў палоне бальшавіцкай прапаганды і агітацыі, выдаваліся за думкі і настроі ўсяго працоўнага сялянства.

Акцэнт рабіўся менавіта на «працоўнае сялянства», бо да яго не адносілі т.зв. «кулацка-заможных сялян», якія складалі прыкладна 5 працэнтаў агульнай колькасці сялянскіх гаспадарак. Галоўнай прыкметай кулацка-заможнай гаспадаркі лічылася выкарыстанне найму пастаяннай працоўнай сілы альбо раней (пры польскай уладзе), альбо на дадзены момант. Іншымі прыкметамі з’яўляліся: наяўнасць гандлёвай лаўкі, болей за 3 сезонныя работнікі, грашовыя пазыкі сялянам пад кабальны (?!) працэнт.

Месца заможнаму селяніну ў бальшавіцкай сацыяльна-палітычнай схеме не знайшлося, таму з самага пачатку існавання савецкай улады ён вымушаны быў зносіць розныя і ўсё больш узрастаючыя цяжкасці і крыўды. Першым крокам на гэтым цярністым шляху сталі надзвычай вялікія падаткі на гаспадарку і натуральныя пастаўкі дзяржаве. Гэта падштурхнула заможных сялян да розных хітрыкаў: утойвання фактычнай колькасці зямлі і жывёлы, адмаўлення ад здачы збожжа дзяржаве, адпісвання часткі зямлі на родзічаў. Так, 27 жніўня 1940 г. абласная газета «Зара» паведамляла, што грамадзянін вёскі Пенічкі Агародніцкага сельсавета Высокаўскага раёна Лазоўскі мае 3 0 гектараў зямлі, якую, натуральна, самастойна апрацаваць не можа і трымае 5 батракоў. Пры ўліку аб’ектаў падаткаабкладання ён унёс батракоў у склад сваёй сям’і [13]. Такім, па афіцыйнай тэрміналогіі, «класава-варожым элементам» даваўся жорсткі адпор.

Другім крокам, які падарваў эканамічную моц заможных сялян, стала абрэзка ў іх зямлі. Яна ажыццяўлялася на аснове пастановы СНК СССР і ЦК УКП(б) ад 18 красавіка 1941 г., якая прадугледжвала абрэзку зямель у гаспадарак, якія мелі болей за 15 гектараў зямлі і ў якіх раней была ці зараз маецца наёмная працоўная сіла.

Непасрэдна гэтай працай займаліся сельскія саветы. Вось адзін прыклад іх дзейнасці: на пасяджэнні Хідрынскага сельсавета дэпутатаў працоўных Кобрынскага раёна ад 6 мая 1941 г. было прынята рашэнне аб абрэзцы зямель у гаспадарак, якія маюць звыш 15 гектараў зямлі. У выніку абрэзка была праведзена ў 30-і гаспадарках, а ўся абрэзаная зямля была залічана ў дзяржаўны фонд [14]. Прычым абрэзка праводзілася і ў тых выпадках, калі зямля была ўжо засеяна. Па нашых падліках, на адну абрэзаную гаспадарку засталося прыкладна 5 гектараў ворыва і 10 гектараў сенажаці, пашы і пусткі.

Трэцім крокам, які даканаў заможнага селяніна, стала ліквідацыя хутароў. А іх колькасць была даволі значнай. Напрыклад, у 1940 г. ў Кобрынскім раёне мелася 3 370 хутароў, Дзівінскім – 2 100, Жабінкаўсім – 660, Антопальскім – 2 000 [15].

У выніку адзначаных мерапрыемстваў заможныя сяляне як асобны сацыяльны слой перасталі мець самастойнае эканамічнае, сацыяльнае і палітычнае значэнне. У лепшым выпадку па сваім эканамічным і сацыяльным стане яны ўраўнаваліся з сялянамі-серадпякамі, а ў горшым – сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій і шматлікіх дэпартацый.

Усе вышэйакрэсленыя мерапрыемствы ў сельскай гаспадарцы Брэсцкай вобласці, на нашу думку, мелі на мэце стварэнне адпаведных эканамічных, сацыяльных і псіхалагічных умоў для развіцця вёскі па шляху стварэння калгаснага ладу. Такі шлях быў прадвызначаны папярэдняй палітыкай савецкай улады, калі напрыканцы 1920-х і ў 1930-я гг. у СССР і БССР была праведзена гвалтоўная калектывізацыя ў вёсцы.

Сутнасць і непазбежнасць, палітычны сэнс і прадвызначанасць калектывізацыі яскрава характарызуе пункт 1 Прыкладнага Статута сельскагаспадарчай арцелі (зацверджаны СНК СССР і ЦК УКП(б) 17 лютага 1935 г.), паводле якога «калгасны шлях, шлях сацыялізму, ёсць адзіна правільны шлях для працоўных сялян». Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва ў гэтай сувязі не збіралася рабіць выключэння для заходнебеларускай вёскі.

Вытворчае каапераванне ў вёсцы Берасцейшчыны распачалося напачатку 1940 г. Асноўнай формай калектыўных гаспадарак стала сельскагаспадарчая арцель (далей – ар-

цель, сельгасарцель), якая стваралася на аснове абагульнення асноўных сродкаў вытворчасці селяніна – зямлі, інвентару і рабочай жывёлы. З кошту абагуленай уласнасці ад 0,25 да 0,5 яе часткі залічвалася ў непадзельны фонд арцелі. Астатняя частка маёмасці залічвалася ў паявы ўзнос арцелі, які выплачваўся сялянам грашыма пры выбыванні з арцелі. Сельскагаспадарчыя работы ў арцелі ажыццяўляліся на асновах здзельшчыны.

Праўленнем арцелі распрацоўваліся і агульным сходам калгаснікаў зацвярджаліся па ўсіх сельскагаспадарчых работах нормы і расцэнкі кожнай работы ў працаднях, якія былі б даступныя добрасумленна працуючаму калгасніку з улікам становішча рабочай жывёлы, машын і глебы. У арцелі не прымаліся кулакі і асобы, якія былі пазбаўлены выбарчых правоў.

Знешне прынцыпы арганізацыі і дзейнасці сельгасарцелі, або, па-іншаму, калгаса, уяўляліся даволі дэмакратычнымі, аднак у рэальным жыцці ўсё адбывалася зусім інакш.

Створаныя арцелі мелі малакалькасны склад, былі эканамічна слабымі. Напрыклад, у Кобрынскім раёне на пачатак 1940 года меліся 4 калгасы, якія разам аб’ядналі ўсяго 142 гаспадаркі: батрацкіх – 41, бядняцкіх – 27, серадняцкіх – 74 [16]. У калгасах меўся востры недахоп вупражы, грубых кармоў, насення канюшыны, сіласных і агародных культур, прыстасаваных жывёлагадоўчых памяшканняў. Калгаснікі не мелі вопыту кіравання гаспадаркай. Усё гэта адмоўна адбівалася на выніках гаспадарання. У калгасах імя Сталіна і імя Варашылава ўраджайнасць бульбы ў 1940 годзе склала ўсяго 10 цэнтнераў з гектара на плошчы ў 20 гектараў. Усе калгасы Кобрынскага раёна не ўнеслі ў банк грашовыя сродкі на папаўненне непадзельных фондаў для набыцця сельскагаспадарчай тэхнікі і рамонту інвентару [16, с. 1–2]. Затое ўсе калгасы поўнасцю выканалі план 1940 г. па абавязковых збожжапастаўках дзяржаве.

Такая бязрадасная сітуацыя склалася ў абсалютнай большасці калгасаў вобласці. На гэта існавалі розныя прычыны: слабая матэрыяльна-тэхнічная база, востры недахоп гатунковага насення і пародзістай жывёлы, агратэхнічных ведаў, вопыту кіравання вытворчасцю. Усё гэта з цягам часу можна было пераадолець. Аднак былі і такія прычыны неэфектыўнасці калгаснай гаспадаркі, якія ліквідаваць улада ўвогуле не збіралася. Першая з іх хаваецца ў галоўнай форме ацэнкі працы калгаснікаў – працадні, якая не дазваляла вызначыць такія складнікі працы, як яе колькасць і якасць. Існавалі вялікія цяжкасці ў налічэнні працадзён за розныя віды працы, бо ва ўмовах панавання савецкай каманднай эканомікі немагчыма было з дапамогай эканамічных метадаў вызначыць рэальны ўклад кожнага калгасніка ў агульную працу. Таму ў аплаце працы сфарміравалася тэндэнцыя да ўраўнілаўкі. З ёй спрабавалі змагацца. Вось што наконт гэтага пісала абласная газета «Зара» ў сваім нумары ад 24 ліпеня 1940 г.: у калгасе імя Сталіна Жабінкаўскага раёна ў налічэнні працадзён існуе ўраўнілаўка. Жанчыне, якая выконвае норму па звязцы снапоў, налічваюць 1,75 працадня і столькі ж жняяру за выкананне нормы. Між тым, сцвярджае газета, праца жняяра больш складаная і намнога цяжэйшая, а значыць, яна даражэй павінна аплачвацца [17]. У сувязі з гэтым паўстае пытанне, на якое газета не дала адказу: наколькі праца жняяра больш складаная і цяжэйшая за працу па звязцы снапоў і якім чынам гэтую розніцу вымераць? Зразумела, што здавальняючага адказу на дадзенае пытанне пры адсутнасці такога арбітра, як рынак, не існавала. З ураўнілаўкай у налічэнні працадзён змагаліся, але перамагчы яе не змаглі, і яна надзейна падрывала стымулы калгаснікаў да плённай працы на палетках і фермах.

Не стымулявала плённую працу калгаснікаў і тая акалічнасць, што на заробленыя працадні яны нічога ці амаль нічога не атрымлівалі. Нешта атрымаць для сябе ў форме натуральнай выплаты яны маглі ў тым выпадку, калі ў калгасе былі поўнасцю засыпаны насенныя, страхавыя і фуражныя фонды, поўнасцю праведзены разлік з дзяржавай. Пры ігнараванні названых умоў любыя спробы выдаць нешта на працадні рашуча асуджаліся і выкараняліся. Напрыклад, восенню 1940 г. ў калгасе імя Варашылава Камянец-

кага раёна наважыліся выдаць на працадзень па 7,2 кг збожжа ў той час, як на 26 коней і 4 свінаматкі засыпалі ўсяго 30 цэнтнераў збожжа. Такі падыход да размеркавання прыбыткаў быў кваліфікаваны як антыкалгасная, антыдзяржаўная справа [18].

Бадай, самае галоўнае, што цягнула калгасы ўніз, заключалася ў згортванні дэмакратычных пачаткаў у іх дзейнасці. Ім даводзіліся шматлікія паказчыкі гаспадарчай дзейнасці, якія насілі дырэктыўны характар і якія часта не ўлічвалі рэальныя абставіны жыцця калгасаў, іх эканамічны стан і вытворчыя магчымасці. Галоўным паказчыкам з'яўляўся аб'ём продажу дзяржаве па мізэрных цэнах сельгаспрадукцыі, які рэгулярна карэкціраваўся ў бок павелічэння.

Адміністрацыйны ціск на калгасы быў паўсюдным і пастаянным. Умяшанне ў калгасныя справы не ведала адміністрацыйных межаў. Архіўныя крыніцы наконт гэтага ўтрымліваюць агромністы пласт матэрыялаў. Але мы абмяжуемся толькі адным прыкладам: на пасяджэнні выканкама Кляшчэльскага райсавета дэпутатаў працоўных 27 студзеня 1941 г. слухалася пытанне аб зацвярджэнні... старшага конюха і загадчыка жывёлагадоўчай фермы калгаса імя Молатава Волькаўскага сельсавета [19]. Было прынята рашэнне зацвердзіць пэўных асоб на адпаведных пасадах.

На пачатак 1941 г. у Брэсцкай вобласці было арганізавана і дзейнічала звыш 120 калгасаў. Па-ранейшаму галоўнай фігурай у вёсцы ў колькасных адносінах, эканамічным і сацыяльным плане з'яўляўся селянін-аднаасобнік. Жыццё яго было незайздросным, як і жыццё калгасніка. Але аднаасобнік меў адну псіхалагічную перавагу перад калгаснікам: ён усё ж такі быў уласнікам сваёй гаспадаркі, хоць і занядбанай, але сваёй, і гэта служыла яму некаторым суцяшэннем у суровых абставінах тагачасных палітычных і сацыяльна-эканамічных зрухаў.

**Заключэнне**

Праведзены аналіз аграрных пераўтварэнняў на Берасцейшчыне ў перадваенны перыяд дазваляе зрабіць наступныя абагульненні:

1. Аграрная палітыка савецкай улады мела featureнабаковы характар. З аднаго боку, на першым этапе яна адпавядала інтарэсам шырокіх слаёў сялянства, бо спрыяла задавальненню яго галоўнага эканамічнага інтарэсу шляхам надзялення зямлёй. З другога боку, яна няўхільна абмяжоўвала эканамічную свабоду і гаспадарчую самастойнасць селяніна праз абмежаванне нормаў землекарыстання, увядзенне шматлікіх падаткаў і вялікіх дзяржпаставак сельгаспрадукцыі. З трэцяга боку, аграрная палітыка спрычынілася да ліквідацыі слоя заможных сялян, якія былі лепшымі гаспадарамі на зямлі.

2. Аграрныя пераўтварэнні мелі стратэгічную мэту – стварэнне эканамічных і сацыяльных умоў, адпаведнай псіхалагічнай атмасферы для падштурхоўвання сельскай гаспадаркі на сацыялістычны шлях развіцця, які атаясамліваўся з калгасным ладам.

3. Грамадскія арганізацыі ў вёсцы, і пер ш за ўсё мясцовыя саветы, выконвалі не столькі сваю галоўную задачу – абслугоўванне інтарэсаў сялянства, колькі з'яўляліся інструментам і правадніком дзяржаўнай палітыкі ў вёсцы, якая супярэчыла карэнным інтарэсам сялянства.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Толочко, Д.М. Роль БССР в материально-техническом обеспечении объединения республики / Осень 1939 года: коренной перелом в судьбе белорусского народа : мат. регион. науч.-практ. конф., посвящ. 70-летию воссоединения Зап. Беларуси с БССР, 24–25 сент. 2009 г. / ред. Н.Н. Ковалёва, Л.Ю. Малыхина. – Брест : БрГТУ, 2009. – С. 198–204.

2. Зара. – 1941. – 30 крас.

3. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 59. – Арк. 82. Заява грамадзяніна Лянчы Мікалая Ігнатавіча ў Кобрынскі райвыканкам аб зніжэнні дзяржпаставак ад 12.06.1940 г.

4. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 45. – Арк. 20. Пісьмо грамадзяніну в. Пескі Сауц Дзяміду Фамічу старшыні Кобрынскага райвыканкама Таранава.

5. Зара. – 1940. – 22 жніўня.

6. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 57. – Арк. 66. Пісьмо старшыні Брэсцкага аблвыканкама Длугашэўскага і сакратара Брэсцкага абкама КП(б)Б Кісялёва кіраўніцтву Кобрынскага райвыканкама ад 15 верасня 1940 г.

7. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 57. – Арк. 110. Данясенне начальніка Кобрынскага райаддзела міліцыі аб бязладным забоі жывёлы ў шэрагу сельсаветаў Кобрынскага раёна (верасень 1940 г.).

8. Зара. – 1940. – 5 ліп.

9. Зара.– 1940. – 23 жніўня.

10. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 45. – Арк. 223. Пісьмо Брэсцкага аблвыканкама старшыні Кобрынскага райвыканкама.

11. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 39. – Арк. 2–3. Рэгістрацыйны спіс дэпутатаў 1-й сесіі Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў працоўных.

12. Зара. – 1941. – 22 мая.

13. Зара. – 1940. – 27 жніўня.

14. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 15. – Арк. 13. Пратакол № 4 пасяджэння Хідрынскага сельсавета дэпутатаў працоўных Кобрынскага раёна ад 6 мая 1941 г.

15. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 19. – Арк. 3, 10, 16, 22. Эканамічная характарыстыка тэрыторыі Кобрынскага, Жабінкаўскага, Антопальскага і Дзівінскага раёнаў.

16. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 72– Арк. 1. Дакладная запіска аб стане калгасаў Кобрынскага раёна і падрыхтоўцы да вясновай пасяўной кампаніі.

17. Зара. – 1940. – 24 ліп.

18. Зара. – 1940. – 15 лістап.

19. ДАБВ. – Фонд 282. – Воп. 1. – Спр. 19 – Арк. 17. Пратакол № 3 пасяджэння выканкама Кляшчэльскага райсавета дэпутатаў працоўных ад 27 студзеня 1941 г.

***Ermakovich L.I.* Agricultural Development of Brest Region in 1939–1941**

Basic actions of Soviet power in the sphere of agriculture of Brest region after the reunion of Western Belarus with BSSR in the autumn of 1939 till the beginning of the Great Patriotic War are considered and analyzed in the article. The main attention is paid to the characteristics of those actions which were directed towards the limitation of economic freedom and independence of a peasant and the creation of corresponding conditions for the development of farms according the socialist (collective farm) way. Economic and social consequences of agrarian reforms, which according to the author contradicted with native essence of peasant way of life and had most evident anti-peasant character, are summed up.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 17.09.2012